# Беларускі арт: будучыня, узброеная прыладамі з мінуўшчыны

Аналітычная група Беларускай Рады культуры • April 30, 2024

Агляд-каталог (студзень – сакавік 2024)

**Свет перакуліўся, сёння стала цяжэй назіраць за сучасным беларускім мастацтвам у самой краіне, чымся за мяжой. У замежжы ж падзеі культурніцкага жыцця выстройваюцца ў густы шэраг, як каляндар “Кожны дзень”, а мантра беларускіх мастакоў працягвае гучаць – “Я выходжу”. Нам, назіральнікам, застаецца адно паўтараць яе штодня, выгрукваць рэплікі на клавіятуры сацыяльных сетак.**

Кожны з нас толькі часам мае магчымасць, мінаючы шкло манітораў, прабівацца да арыгіналаў мастацкіх твораў, работаў за тысячы кіламетраў. Тут, за мяжою рэальнай і віртуальнай, за першы квартал 2024 года мне на вочы трапіліся 98 згадак пра сучаснае мастацтва Беларусі: 28 гукаў студзеня, 31 фарба лютага і 39 думак сакавіка.

Суб’ектыўная статыстыка. Не маючы магчымасці гэтак жа свабодна і бяспечна рухацца геаграфічнымі абшарамі радзімы, без беспасярэдняга кантакту, глядзення на ўласныя вочы, амаль што немагчыма казаць пра аб’ектыўнае даследаванне. Без элементарнае свабоды, тым больш падчас рэпрэсіяў і пераследаў, цяжка ўявіць ідэальныя рэпрэзентацыі, а без іх – паспяховае развіццё мастацтва. І ўсё ж застаецца надзея, што менавіта выказванні ў гэткіх складаных абставінах і могуць адлюстраваць сапраўдную рэчаіснасць, адпавядаюць характару эпохі. Праз іх можна даведацца пра нешта годнае ўвагі і якасці.

## Частка I

***

Палітыка не перастае адбівацца ў мастацтве. Нявырашанасць галоўных пытанняў скрозь боль ды асэнсаванне будучыні будзе і далей заставацца ў тэме распрацоўвання стратэгіяў. І калі за межамі краіны мы маем больш-менш адкрытае поле для крытычнае прэзентацыі і дыскусіяў, то ў Беларусі ўсё болей

відавочным робіцца матыў закладніка пад коламі рэпрэсіўнае машыны, пра што адкрыта і з такой асалодаю казаў не так даўно міністр культуры.

**06.01.2024**

EBB / ЭББ

What Have We Done? / “Что мы наделали?”

CURRENTS: Free Expression and the Inexpressible

A.I.R. GalleryNY, Нью-Ёрк

*У час катастрофы мы хочам зразумець, як гэта – апынуцца на няправільным баку гісторыі.*

**23.02.2024**

Марына Напрушкіна

Kyiv Perennial

nGbK / neue Gesellschaft für bildende Kunst, Берлін

*Рэалізацыя Міжнароднага кіеўскага біенале з удзелам работнікаў культуры ў час вайны – выклік для інстытуцыяў і асобаў, якія бяруць удзел у гэтай справе.*

**23.03.2024**

Святлана Алексіевіч, Марына Напрушкіна, Вольга Шпарага

Дыскусія падчас кніжнага кірмашу ў Ляйпцыгу

*Як мы можам думаць пра будучыню ў святле шматлікіх крызісаў сучаснасці, што нас трывожаць і паралізуюць? Якое натхненне і заахвочванне мы можам атрымаць у барацьбе за дэмакратыю ва Усходняй Еўропе?*

***

Сёння культурніцкія і мастацкія падзеі з краіны агучваюцца як навіны цэнзуры, чорных спісаў, закрыцця выстаў, звальнення з працы, выключэння з творчых саюзаў. Праз іх можна даведацца пра нешта годнае ўвагі і якасці. І гэта толькі рысы забароны на прафесію. Далей ідуць і арышты, і турмы, і забойства. Непазбежная логіка абвешчанае вайны, найперш вайны культураў. Здаецца, нашая будучыня ў краіне будзе карыстацца прыладамі з мінуўшчыны: андэграўнд, партызанінг, субкультура і ананімнасць стануцца зноў нормай, а кватэрнікі і лес будуць іх прасторай. А інфармацыя ўвесь час будзе падавацца праз сіта каб не нашкодзіць. Пра стан падзеленасці ўсё часцей будзе расказваць шызафрэнічны рытм падзелу на тут і там, там, там, там…

**15.01.2024**

Уладзімір Кандрусевіч

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Мінск

*Адмена! Выставу, якая прайшла ўсе ўзгадненні, забаранілі на этапе мантажу. Тэатр беларускай драматургіі.*

**02.02.2024**

“1,10 квадрата”

Рэспубліканская мастацкая галерэя “Палац мастацтва”, Мінск

*У Мінску выставу, прысвечаную 110-годдзю карціны “Чорны квадрат” Казіміра Малевіча, закрылі на трэці дзень працы экспазіцыі.*

**02.02.2024**

Выстава малюнкаў Васіля Быкава

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Мінск

*Стала вядома, што выставу, прымеркаваную да 100-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, спешна закрылі.*




Афіша выставы да 100-годдзя Васія Быкава. Крыніца: bellitmuseum.by

***

Усё складаней будзе ладзіць вялікія праекты ды імпрэзы, што прэзентуюць аўтараў з усіх бакоў, без дадатковых рызык. Тут супраца з замежнымі актарамі паспрыяе як пашырэнню магчымасцяў, гэтак і інтэграцыі. І хто ведае – можа, менавіта гэта час для індывідуальных стратэгіяў, якія заўсёды былі прыкметай еўрапейскасці, роўнай свабодзе асобы.

**02.03.2024**

manchmal halte ich mich an der luft fest / часам я трымаюся за паветра

Куратары – Катарына фон Гаґенаў, Уладзімір Грамовіч, Паўліна Альшэўская

Galerie im Körnerpark, Берлін

*Маладыя беларускія мастакі ў эміграцыі азіраюцца на пратэсты, што карэнным чынам змянілі іхныя жыцці і паўплывалі на наступныя гады. У сваёй творчасці яны закранаюць тэму рэпрэсіяў у роднай краіне і страх сталага назірання за іхным жыццём з боку ўладаў, якія не заканчваецца нават у эміграцыі.*



Праект "часам я трымаюся за паветра". Леся Пчолка. Базы. Фота: Ніхад Ніно Пушыя. Крыніца: https://galerie-im-koernerpark.de/

**13.03.2024**

Oniryczna rzeczywistość / Анірычная рэальнасць

Куратары – Вольга Мжэльская, Міхал Ярэмі Стшэлецкі

Emi_Art_Warsaw, Варшава

*Рэальнасць – маргіналізаваная, схаваная, што існуе найчасцей па-за зонаю паўсядзённага жыцця чалавека. Яна робіцца тоеснай чалавеку, а асобныя яе месцы адпавядаюць розным пластам не толькі чалавечае псіхікі, але і цялеснасці.*

**22.03.2024**

Фестываль, зладжаны Goethe-Institut im Exil [Belarus]

Kunsthaus ACUD, Берлін

*Дзясяткі імпрэзаў з удзелам больш як 50 тэатральных дзеячаў і дзяячак. Міждысцыплінарная праграма, што адлюстроўвае жывасць і разнастайнасць культурніцкае сцэны беларускае дыяспары ўнутры і звонку Нямеччыны.*

**20.03.2024**

4 Aukcja Charytatywna na rzecz Uchodźców

Piękna Gallery, Варшава

*Фонд Humanosh супольна з Piękna Gallery і Communiction Unlimited ужо чацвёрты раз ладзяць дабрачынны аўкцыён твораў мастакоў з Беларусі, Украіны, Польшчы і ЗША на дапамагу ўцекачам.*

***

Беларусь, не зважаючы на працяг вайны і ўдзел у ёй на баку агрэсара, усё больш прэзентуецца як ахвяра, што супрацьстаўляецца “пераможцы”. Відавочна, такі погляд ідзе на карысць сучаснаму ўспрыманню сапраўднае героікі і гларыфікацыі супраціву. Таму не перастае быць актуальнаю тэма рэпрэсіяў, а палітычныя вязні застаюцца галоўным брэндам беларускасці. Але ў нейкім сэнсе ён жа і адводзіць увагу ад агрэсіі супраць Украіны, падкрэслівае асаблівасці гістарычнага шляху кожнага народу.

**30.01.2024**

Яўгенія Палуян

Бязвінныя

Беларуская прастора “Робім разам”, Варшава

*Амаль 300 партрэтаў палітычных вязняў, намаляваныя паводле фотаздымкаў. Сотні бязвінных вачэй застылі ў нямым чаканні дыялогу.*

**30.01.2024**

Павел Севярынец

У сэрцы – Беларусь

Dom Wschodni, Варшава

*Прэзентаваныя малюнкі грамадскага і палітычнага дзеяча, якія лідар “Маладога фронту” стварыў за кратамі ў Шклоўскай турме.*

**01.02.2024**

Вольга Якубоўская. 25 Steps to Freedom

Riga City Council, Рыга

Выстава закліканая адлюстраваць мірны характар беларускіх пратэстаў 2020 года. 08.02.2024 профілі мастачкі Вольгі Якубоўскай у Instagram і Facebook прызналі экстрэмісцкімі матэрыяламі.

**21.02.2024**

Андрэй Курэйчык і Дзіяна Купса

Voices of the New Belarus

Carroll Gallery Tulane University, Новы Арлеан, Луізіяна

*Выстава і мастацкая інсталяцыя на падтрыманне палітычных вязняў. Цяпер, калі ў Беларусі спрабуюць знішчыць нашую салідарнасць, пра гэта важна казаць, каб дабіцца іхнага вызвалення.*

**11.03.2024**

Ксіша Анёлава, Наталля Гарковіч

Беларускі мартыралог

Institut Paměti národa, Брно

*Мартыралогам у царкоўнае традыцыі называюць спіс пакутнікаў. Выстава партрэтаў беларускіх палітычных вязняў паўстала на базе даследавання мастачкі і праваабаронцы.*



Фрагмент выставы "Беларускі мартыралог" у г. Брно. Крыніца: belarus2020.churchby.info

**14.03.2024**

Дзіяна Пінчук

Магшоты палітвязняў

Каўоркінг FBC, Варшава

*Фотавыстава пра фатаграфаванне ў зняволенні і сустрэча з былымі палітычнымі вязнямі.*

**22.03.2024**

Руфіна Базлова

The History of Belarusian Vyzhyvanka

ACUD Studio, Берлін

*Вышыванка – своеасаблівы код запісу звестак пра жыццё народу. Мастачка выкарыстоўвае гэты носьбіт, каб апавесці бягучую гісторыю беларускага паўстання, прычым кожная выява адпавядае рэальнай падзеі, што адбылася падчас пратэстаў.*

***

Смерць ідзе побач. А ў такі час асабліва балюча адчуваецца страта асноўных фігураў беларускага мастацтва. Феномен мемарыялу і музеіфікацыі мастацтва – не столькі пра памяць, колькі пра працяг яго існавання, нават па-за жыццём аўтара.

**25.01.2024**

Уладзімір Парфянок

Віленскі альбом

Куратар – Андрэй Антонаў

Віленскі беларускі музей імя Івана Луцкевіча, Вільня

*14 студзеня 2023 года пайшоў з жыцця Уладзімір Парфянок, знаны беларускі фатограф, куратар выставачных праектаў, стваральнік і кіраўнік галерэі візуальных мастацтваў Nova. Здымкі на выставе паходзяць з вялікае серыі "Фрагменты быцця".*



Уладзімер Парфянок. З серыі «Віленскі альбом». Крыніца: www.facebook.com/lutskevichmuseum

**26.01.2024**

Міхал Анемпадыстаў

Простыя рэчы

Гасцёўня Беларускай Рады культуры, Вільня

*Падзея прымеркаваная да дня памяці знанага беларускага дызайнера, фатографа, культуролага, мастацтвазнаўцы, паэта ды складаецца з унікальных фатаграфічных і плакатных работаў мастака. Беларускі ПЭН абвясціў прыём заявак на прэмію імя Міхала Анемпадыстава.*

**24.03.2024**

Алесь Пушкін

Wystawa obrazów artysty Alesia Puszkina

"Робім разам", Варшава

*Да Дня Волі адкрылася выстава арыгінальных карцінаў мастака. Усе працы паходзяць з асабістых калекцыяў польскіх знаўцаў творчасці Пушкіна.*

Чытаць працяг

Report content on this page